*Шніп, М. А.* Хронікі XVI ст. аб мяцяжы М. Глінскага ў ВКЛ: пачатак гістарыяграфічнай традыцыі / М. А. Шніп // XXI век: актуальные проблемы исторической науки: Материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию ист. фак. БГУ. Минск, 15–16 апр. 2004 г. / Редкол.: В. Н. Сидорцов. (отв. ред.) и др. – Мн: БГУ, 2004. – С. 110–112.

**М. А. ШНІП**
***Рэспубліка Беларусь, г. Мінск***

# ХРОНІКІ XVI СТ. АБ МЯЦЯЖЫ М. ГЛІНСКАГА Ў ВКЛ: ПАЧАТАК ГІСТАРЫЯГРАФІЧНАЙ ТРАДЫЦЫІ

Важным здарэннем на абшарах Усходняй Еўропы XVI ст. стаў мяцеж, узняты ў 1508 г. у Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ) князем Міхалам Глінскім. Сам князь і яго дзейнасць, бясспрэчна, былі з'явамі агульнаеўрапейскага маштабу. Таму невыпадкова, што выступ Глінскага трапіў на старонкі многіх гістарычных твораў ВКЛ, Польшчы і Рускай дзяржавы XVI ст.

Аднак творы тагачасных гісторыкаў часта адрозніваюцца пэўнай тэндэнцыйнасцю ў асвятленні дзейнасці М. Глінскага. Утрымліваюць яны шэраг сумнеўных, а часам проста выдуманых звестак, сукупнасць якіх з цягам часу стала ўстойлівай гістарыяграфічнай традыцыяй, што пратрымалася да XX ст.

Міхал Глінскі сапраўды займаў высокае становішча ў ВКЛ у часы Аляксандра Ягелона, але супрацьпастаўленне яго панам-радзе Вялікага княства, паводле «Хронікі Быхаўца», «Хронікі» Стрыйкоўскага, «Хроники Литовской и Жмойтской» не адлюстроўвае рэальнага стану рэчаў. Пры двары Аляксандра не існавала дакладна акрэсленых магнацкіх партый, што пацвярджаюць акты Метрыкі ВКЛ [1, № 702, 706]. Час княжання Аляксандра можам назваць адным з этапаў барацьбы паноў-рады за пашырэнне сваіх правоў. Таму часта ў крыніцах адносіны вялікага князя з раднымі панамі маюць канфрантацыйны характар. Але да складу апазіцыйнай групоўкі з упэўненасцю можна аднесці толькі віленскага біскупа Войцэха Табара і маршалка земскага Яна Забярэзінскага.

Польскія храністы Мацей Мехавіта, Людвік Дэцый і Бярнард Вапоўскі, чые хронікі з'яўляюцца найбольш раннімі з усяго масіву наратыўных крыніц, што датычацца мяцяжу,



прыпісваюць Глінскаму імкненне захапіць вялікакняжацкі трон [11, *28*; 13, *276*; 15, *58*]. І калі ў Дэцыя і Вапоўскага заявы гэтыя можам назваць асцярожнымі, то паводле Мехавіты злачынныя намеры Глінскі меў яшчэ ў 1506 г., за два гады да мяцяжу.

Усе беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі прыпісваюць Міхалу Глінскаму ініцыятыву ва ўсталяванні кантактаў з маскоўскім князем і расцэньваюць гэта як здраду. Так, згодна з Вапоўскім, Стрыйкоўскім і «Хроникой Литовской и Жмойтской» пагадненне Глінскіх з маскоўскім князем адбылося яшчэ да забойства Забярэзінскага [8, *102*; 14, *343*, *346*; 15, *77*]. У той жа час дадзеныя «Русского временника» па Румянцаўскаму спісу, «Первой Софийской летописи» дазваляюць сцвярджаць, што Глінскія перайшлі на маскоўскі бок толькі пасля таго, як стала зразумела, што перамовы з Жыгімонтам і панамі-радай ВКЛ бесперспектыўныя [4, *53*; 5, *70–71*]. Прычым маскоўскі князь першым выслаў сваіх прадстаўнікоў да Глінскага з прапановай перайсці да яго на службу.

Згодна з хронікамі М. Стрыйкоўскага, М. Бельскага, А. Гваніні (калі прыняць яго аўтарства), «Литовской и Жмойтской», «Евреиновской летописью» і «Русским временником», на бок Глінскага і маскоўскіх ваяводаў перайшлі князі Друцкія. Але калі паводле рускага летапісу, а таксама хронік Дэцыя і Вапоўскага і пасольстваў Жыгімонта I, гэта было бадай што адзіным поспехам мяцежнікаў, то астатнія названыя хронікі пашыраюць спіс завяваных Глінскім з дапамогай маскоўскіх войскаў гарадоў. Так, яны прыпісваюць ім узяцце Оршы, Крычава, Гомеля, а таксама паведамляюць аб пераходзе на бок Глінскіх мсціслаўскага князя Міхаіла Заслаўскага [2, *167*; 8, *103*; 9, *458*; 12, *77*; 14,

*346*]. Між тым Гомель яшчэ ў 1500 г. быў заваяваны маскавітамі, а князь Мсціслаўскі і Крычаў часова перайшлі пад уладу Васіля III толькі ў 1514 г. [3, *124*].

У хроніках другой паловы XVI ст., такіх як Хроніка Стрыйкоўскага, Марціна Бельскага, «Евреиновская летопись», выступ Глінскага адлюстроўваецца як рух праваслаўнай знаці, незадаволенай сваім становішчам у ВКЛ. Часта М. Бельскі і А. Гваніні ў сваіх гістарычных творах прыводзяць звесткі з «Хронікі» Стрыйкоўскага. Сам М. Стрыйкоўскі паўтарыў і развіў некаторыя, хаця і неканкрэтныя выказванні Дэцыя і Вапоўскага. Так, Бярнард Вапоўскі, не ўзгадваючы, што Міхал Глінскі быў каталіком, падкрэслівае, што «русіны грэцкага абраду трымалі бок Глінскага, і сярод яго кліентаў і прыхільнікаў найбольшая частка былі русіны» [15, *76*]. Дэцый крыху ў іншым святле адлюстраваў такое становішча: «Міхал Глінскі шмат шляхты рускай абяцаннямі і падарункамі, а таксама надзеяй на перамогу на свой бок прыцягнуў» [11, *34*].

Але М. Стрыйкоўскі дадае і сваю, арыгінальную, версію матываў дзеянняў Глінскага. У прыватнасці, ён лічыў, што Глінскія імкнуліся стварыць самастойнае Рускае княства і перанесці вялікае княжанне з Вільні ў Кіеў і такім чынам адрадзіць Кіеўскую манархію [14, *346–347*]. Гэтым жа Стрыйкоўскі тлумачыць і аблогу Глінскім Слуцка – князь нібыта спадзяваўся прымусіць Анастасію Слуцкую ўзяць з ім шлюб, што давала б яму правы прэтэндаваць на Кіеўскае княжанне, бо правы такія фармальна мелі князі Слуцкія.

Не трэба выключаць магчымасці, што ў версіі аб «Кіеўскай манархіі», якая ўзнікла ў канцы 70-х гг. XVI ст., маглі знайсці месца пагалоскі прапановы Менглі-Гірэям Кіева Глінскім, калі б яны перайшлі на яго бок. Нельга забываць і аб тым, што сам аўтар, М. Стрыйкоўскі, знаходзіўся пэўны час пад уплывам магнатаў Хадкевічаў, якія былі яго мецэнатамі і мелі роднасныя і палітычныя сувязі з Алелькавічамі-Слуцкімі [6, *75*]. Стрыйкоўскі нават жыў некаторы час у Слуцкіх, наведваў ваколіцы іх уладанняў, месца бітвы пад Клецкам. Такім чынам, тая частка яго хронікі, што апісвае падзеі, звязаныя з аблогай Слуцка і рабаваннем ваколіц горада войскамі М. Глінскага і маскоўскага князя, магла быць напісана пад моцным уплывам саміх князёў Слуцкіх, якія пацярпелі ад князя-мяцежніка. У той жа час ёсць падставы казаць, што Міхал Глінскі, каб прыцягнуць на



свой бок больш прыхільнікаў, абвясціў сябе абаронцам праваслаўя і гэтым тлумачыў усе свае дзеянні.

Многія ўзгаданыя вышэй гістарычныя творы паўсталі пры двары Жыгімонта Старога альбо ў асяродку магнатэрыі ВКЛ. У прыватнасці «Chronica polonorum» М. Мехавіты выйшла ў свет у 1519 г. Але ўвесь тыраж першага выдання «Хронікі» быў канфіскаваны па загаду арцыбіскупа Я. Ласкага, былога кароннага канцлера, і старонкі 287, 347–372 былі заменены на тэндэнцыйна адрэдагаваныя самім Ласкім [6, *68*]. І хаця не ўсе праўкі паходзілі менавіта ад яго, тыя, што адносяцца да дзейнасці Глінскага, смерці Аляксандра і абрання Жыгімонта, бясспрэчна, напісаныя Янам Ласкім [10, *45–46*].

Наступнікі Мехавіты Л. Дэцый і Б. Вапоўскі займалі пасады каралеўскіх сакратароў і гістарыёграфаў пры Жыгімонце I, таму і іх творы мусілі падаваць дзейнасць Глінскага ў святле афіцыйнага і пануючага меркавання.

Творамі Мехавіты, Дэцыя і Вапоўскага карысталіся практычна ўсе пазнейшыя храністы, такія як Кромер, Стрыйкоўскі, Бельскі і інш. Таму многія факты з ранніх хронік проста пераходзілі ў пазнейшыя і з цягам часу не падвяргаліся сумненню, тым больш, калі не разніліся з агульнай гістарыяграфічнай традыцыяй.

Хроніка Быхаўца абрываецца на 1506 г., хаця ў запісе пад 1500 г., калі Аляксандр надаў Глінскаму маршалкоўства, аўтар абяцае аб ім «много дивного» напісаць [7, *167*]. Напэўна, пад гэтымі словамі крыецца не толькі бітва пад Клецкам, а і падзеі мецяжу.

Знікненне апошніх старонак хронікі магло мець і невыпадковы характар, калі падзеі ў ёй асвятляліся інакш, чым у польскамоўных хроніках.

Усе вышэй узгаданыя крыніцы былі створаны пасля мяцяжу Глінскага і яго пераходу ў Маскоўскае падданства, таму вобраз князя-здрадніка добра стасоўваўся ў гістарычных творах з тымі злачыннымі намерамі яшчэ ў часы кіравання вялікага князя Аляксандра, якія яму прыпісвалі храністы.


1. Акты Литовской Метрики. Т. 1. Вып. 2. Варшава, 1897.
2. Евреиновская летопись // Полное собрание русских летописей (ПСРЛ). Т. 35. М., 1980.
3. *Кром М. М.* Меж Русью и Литвой. М., 1995.
4. Первая Софийская летопись // Полное собрание русских летописей, изданное по высочайшему повелению Археографическою комиссиею. Т. 6. Спб., 1853.
5. Русский временник: Зимин А. А. Новое о восстании М. Глинского в 1508 г. // Советские архивы. М., 1970. № 5.
6. *Семянчук А. А.* Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі. Гродна, 2000.
7. Хроника Быховца // ПСРЛ. Т. 32. М., 1975
8. Хроника Литовская и Жмойтская // ПСРЛ. Т. 32. М., 1975.
9. *Bielski M.* Kronika Marcina Bielskiego niegdyś w Krakowie drukowana teraz z nowu z doprowadzeniem aż do Augusta III przedrukowana // Zbiór dziejopisów polskich we czterech tomach zawarty. T. 1. Warszawa, 1764.
10. *Bostel F.* Zakaz Miechowity. Lwów, 1884.
11. *Jodok Ludwik Decjusz*. Księga o czasch króla Zygmunta. Warszawa, 1960.
12. *Gwagnin A.* Kronika Sarmacjey Europskiej. Kraków, 1611.
13. Lectiones variantes primae editionis (anni 1519) Matthiae de Miechow Chronicae Polonorum // Wapowski B. Kroniki Bernarda Wapowskiego z Radochoniec. Część ostatnia, czasy podługoszowskie obejmująca (1480–1535). Kraków, 1874.
14. *Stryjkowski M.* Kronika Polska, Litewska, Żmudska i wszystkiej Rusi. T. II. Warszawa, 1846.
15. *Wapowski B.* Kroniki Bernarda Wapowskiego z Radochoniec. Część ostatnia, czasy podługoszowskie obejmująca (1480–1535). Kraków, 1874.